Хрысьціна Курчанкова



...мая мова забытая,

а я – вырваны аркуш...

# Князёўне баіў цмок

***МОЙ ЛЕМАНТАР***

*Я – згубленая старонка сярэднявечнага леманта-ра. Толькі не кажыце, што ў Сярэднявеччы не было лемантароў. Аднекуль жа мяне вырвалі, недзе ж была тая краіна-кніга, у якой тры тузіны маіх складоў уліваліся ў казачку пра жахлівае каханьне й вернага цмока. Ці наадварот? Я забылася…*

*Бо сёньня я ляжу ў стосіку макулатуры (чытай – маскультуры?). Мяне заціснулі недзе паміж гісто-рыяй КПСС і дапаможнікам для кампутарных “чай-нікаў”. Зьлева – надарваныя ўлёткі, справа – хмара-чосы жоўтай прэсы. Усе яны – састарэлі, хто год таму, хто – учора. А я… я вучыла дзяцей чытаць, ды нехта іншы навучыў іх зьбіраць макулатуру.*

*Пальцы, запэцканыя ў попел, ператасоўваюць*

*мяне са стосіка ў стосік. Я так аднойчы й прачытала – “тусоўка”. Але гэта слова не маёй мовы. Мая мова забытая, а я – вырваны аркуш. Ды як раней я вучу сваёй мове іншаземцаў, іншаверцаў, іншамоўцаў, іншадумцаў… Як вы лічыце, ёсьць нештачка гераічнае ў адстойваньні правілаў граматыкі? Я ўпарта паўтараю тры тузіны маіх складоў, я заклікаю зьвярнуць увагу на готыку маіх літараў, на выкшталцоныя малюнкі ня вашага стагодзьдзя. Мне кажуць: “гэта ня модна”, “так сёньня ня мовяць”, “такое ня носяць”, “гэтак ня пішуць”. Я ж паўтараю тры тузіны маіх складоў і дазваляю вам – самім! – дадумаць канцоўку. Даруйце, я вырваная з кантэксту, я – толькі ўрывак.*

*Я сустракала тэксты маёй мовы, крыху скажонай… аленазовы! Я ня ўмею руйнаваць гарады, не гатую крупнік, не шапчу замовы, не люблю двухсэнсоўнай аўтэнтыкі, жахаюся малюнкаў зброі, не выношу парушэньняў стылю. Я старонка лемантара – я не лямантую – я – вучу – чытаць!..*

*Не, пераплаўкі ня будзе. Я не аддам маіх літараў, так рупліва выведзеных на пергаменьце. Хутчэй яны згубяцца ў сеціве зморшчынак на маім твары. Хутчэй мая скура рассыплецца цёмна-шэрым попелам… Я маю толькі адную просьбу.*

*…Мой Кніжны Ойча, калі Ты ёсьць, мой Аўтар. Дай моцы… дай моцы прайсьці мне праз віскат мышыны, праз жах пацучыны, праз сальныя пальцы й пекла агменю… Там, дзе бляск нябёсаў, дзе Неба-Кніга, мой Ойча… дазволь мне завершыць фразу. Пастаў на мне ўрэшце кропку.*

III

З паўднёвых сходаў пырснулі шкляныя пацеркі, збочылі ў паўзмрок калідораў, пакаціліся па галерэях і залах, пасыпаліся праз разныя парэнчы, праз стрэльчатыя вакенцы… падалі зіхоткімі кроплямі, разьбіваліся на дне мураванага калодзежу замкавай вежы – так, што калацілася, заходзілася срэбрам рэха.

З усходняй галерэі зьляцелі аскепкі сьмеху, прашапацелі перагорнутыя старонкі; жальба кацяняці й абрывак калыханкі доўга ня падалі, кружлялі, падхопленыя павевам, — ня словы, толькі згадка, летуценьні воглых скляпеньняў. І скразьняк з-за павароту – ці шэпт ядвабнай сукні? Гэта трызьняць уголас выстылыя камяні. Няўжо ты верыш, што гэта ня цені?!

У паўночных калідорах жывуць прывіды – ЯНА з імі не сябруе. Чуеш тупат маленькіх ножак? Чуеш, шапоча сукня, скардзіцца прыціснутае локцікам кацяня, ледзь улоўна трымцяць струны (аёй! у яе шчэ й арфа пад пахай!). Зараз ЯНА зьбяжыць з заходняй лесьвіцы (завершыць віток па сьпіралі часу) – проста да цябе, хто застыў і трызьніць, і ловіць гукі, якія коцяцца шклянымі каралямі праз зьмяркальныя калідоры, сыплюцца на каменныя пліты з галерэяў і арак, сьлізгаюць з пальцаў, падаюць – дзынг! – і рассыпаюцца пырскамі рэха…

І табе падаецца, бяздомны вандроўнік, што тое рэха ты чуў калісьці, што з дна сярэднявечнага мураванага калодзежу ты бачыш зоркі тваёй

РАДЗІМЫ. І ты верыш – не, ты *амаль* верыш – што зараз з паўднёвага павароту выбежыць маленькая князёўна твайго дзяцінства й заплача, як калісьці, над парванымі пацеркамі.

Няхітрая справа – нізаць каралі, дзеля гэтага табе зусім ня трэба быць чарнакніжнікам. Але ты – Чарнакніжнік, і ты не здольны суцешыць князёўну. Шкляныя каралі разьбіліся — жменю шклянога пылу не нанізаць ні на срэбную нітку, ні на залаты волас князёўны, ані на тваю абгарэлую памяць.

111

— Я ведаю, чаму ты – Чарнакніжнік. Ты счарнеў ад сваіх кніг!

— Не зусім так, спадарычна. Калісь я быў сьветлы, як старонкі твайго лемантара. Я любіў глядзець на сонца й агонь у печы, пакуль новае сьвятло не асьляпіла мяне – сьвятло вогнішча на пляцы, яго далі мае кнігі — згараючы. Літаркі разьбягаліся жвавымі пачваркамі, разьляталіся пырскі іскраў, ссыхала, моршчылася скура на тварах кніг. Я нахіліўся надта нізка – і з таго часу не магу адмыць попел з валасоў і твару, і з таго часу не здымаю жалобу, – і вучу кнігі на памяць… Ты ня бачыла, як паляць кнігі?

— Я чула, што паляць людзей. Але – кнігі?.. Дзікунства… Сумная казка. Ды распавядай яшчэ. Хто ты? Якога роду?

— Сам я ня памятаю, але людзі кажуць (а людзі ў гэткіх справах абазнаныя) – нібы мая маці была князёўна, а мой бацька – цмок.

— Лухта! Ты маніш, Чарнакніжнік. Глядзі, я паклічу тату й ён спаліць цябе на пляцы; вядома, кнігі ён пакіне сабе.

— …Людзі кажуць, нібы яны кахалі адно аднаго, як толькі могуць кахаць цмок і князёўна. Але рыцар у бліскучых латах, адважны й паважны, працяў майго соннага бацьку дзідай і ўзяў за сябе маю гаротную маці.

— Так не бывае, ты ўсё хлусіш. Усе твае гісторыі – сумныя. Князёўны не кахаюць цмокаў, рыцары б'юцца па законах гонару, а…

— …А тыя законы ім пішуць цмокі.

— Не хачу больш чуць пра цмокаў. Ты варажбіт? Тады адкажы, якая будзе мая краіна, калі ў сьвеце не застанецца цмокаў?

— Цмокі застануцца да скону сьвету. А вось тваёй краіны ня будзе.

— Хлус! Хлус! Хлус! Мая краіна будзе заўсёды.

— Я мог бы зманіць табе, спадарычна, бо я баюся вогнішча й сьмерці. Ды шчэ больш я баюся, што ты заўважыш маю няшчырасьць – і казкі іншага завалодаюць тваім сэрцам… Забудземся на цмокаў, спаленыя кнігі й страчаныя землі. Я распавяду табе…

— Не, Чарнакніжнік! Калі ты баішся вогнішча, калі ты хочаш, каб я слухала твае казкі, — ты распавядзеш мне… ты скажаш мне – скажаш! – што будзе з маім краем!..

Аей! Дзяўчо, ты прыўзьнялася ў крэсьле, ты забылася на кацяня й яно гуляе срэбным пасам, ты тупаеш ножкай і амаль плачаш… Што сказаць табе? Як суцешыць? У цябе парваліся каралі? Павер, твой

Чарнакніжнік дастаў бы табе на пацеркі зоркі з другой паловы неба (ты такія ніколі ня бачыла)… Але табе трэба твая краіна. Ён жа ня мае й сваёй. Паслухай, спадарычна, паспрабуйма забыцца, пачнем нанова…

З паўднёвых сходаў пырснулі кроплі рэха… і доўга зьвінелі ўвушшу:

— Што будзе далей з маёй краінай?!

## *ЦМОК І СМЫК*

*Скрыпка над пляцам. Скрыпка — брук успарола смыкам,*
*горад працяла навылёт і разбудзіла вецер.*
*Храмы, аркі, скляпеньні — нібы шкляныя каралі, —*
*хмары, стагодзьдзі, душы ніжа ды ніжа на струны.*
*Хто палічыць здольны, колькі анёлаў і д'яблаў,*
*колькі прарокаў і цмокаў – на канцы таго смыка?..*

*Пляц напяўся пад цяжарам зброі, людзей і цмокаў –*
*праз шчыліны бруку сочацца цені былых герояў.*
*Яны падымаюцца ў неба й кружляюць у дзікім танцы*
*над мяккацелымі воямі ды сінтэтычным яшчарам,*
*над маленькай скрыпачкай, якая заплюшчыла вочы,*
*якая стаіць нерухома ў цэнтры вялікай бітвы.*

*Скрыпка пяе пра вецер, што сьцяг зрывае ды гоніць*
*над царквой, над касьцёлам, над руінамі замкаў,*
*над бязьлюднаю багнай гэтай хворай краіны,*
*глуханямой вар'яткі — што сёньня нема галосіць.*

*Вецер зблытаў галовы цмокаў, людзей і зданяў,*
*шалёна скачуць прывіды, лупцуюць сваіх і чужынцаў.*
*Толькі скрыпачка застыла, сьціснуўшы смык, нібы зброю.*
*Цені над пляцам, цені. Скрыпка над пляцам. Скрыпка.*

*Лепш не глядзі, князёўна, — гэта апошняя бітва,*
*міма імчаць імкліва пысы, ашчэры, пачвары.*
*Твой цмок пасеў на званіцы, цікуе цябе ды сочыць,*
*як б'юцца забаўна міжсобку рыцары розных эпох.*

*Дубінка спружыніць аб латы – іскры ня выбіць гумай.*
*Тупіцца меч аб шклапластык найноўшых празрыстых шчытоў.*
*Вострыцца смык аб струны – спружыніць аб нашы сэрцы.*
*Крыжы ў сінечы ці краты – меч, дубінка ды смык.*

*Зьехаў шалом на вочы – лупцуе ліхтарню рыцар –*
*яго не вучылі магістры змагацца з гумовым яшчарам.*
*Цісьнецца да аўтобусаў, выпусьціў з рук рацыю,*
*кліча маму й Госпада хлопчык-міліцыянт.*

*Цішай, князёўна, цішай. Войска тваё разьбітае.*
*Нема галосяць здані, у сутаргах б'ецца край.*
*Колькі можна, скрыпачка, сэрца рваць і ня плакаць –*

*сябар упаў пад дубінкай, цмок не ўпадзе пад смыкам,*
*шчэрыцца ён са званіцы…*
*А нехта штурхнуў князёўну,*
*вырвалі смык, зламалі, у брук утапталі скрыпку…*
*Вецер над пляцам, вецер цені разносіць, цені;*
*аркі, хмары, стагодзьдзі зрывае са струн парваных…*

*Цмок уцягнуў галовы ў норы шматпавярховак.*
*Цмок здаў дубінкі й рацыі на склады пастарункаў.*
*Над пляцам – вясновы вечар!.. Ціха, бы ў чэраве зьвера.*
*Лунаюць бяздомныя цені. Паснулі рыцары ў турмах;*
*дасьпехі — на пераплаўцы, з іх выкуюць ранкам плугі,*
*каб новыя рыцары заўтра кармілі новага цмока.*

*Вочы расплюшчы, князёўна, ты адна засталася на пляцы,*
*падыміся з халоднага бруку, уцякай у Сярэднявечча.*
*Рыцар твой цябе не разбудзіць, не разбудзіць разьбітую скрыпку,*
*не падорыць табе каралі з іклаў апошняга яшчара.*

*Уцякай, уцякай, князёўна, бо крадзецца на задніх лапах,*
*каб уліць з пацалункам у вусны абыякавасьці атруту*
*(што зрабіла з радзімы казак – глуханямую жабрачку),*
*вечны цмок твайго беднага краю – цмокі здаўна кахаюць князёўнаў.*

111

— Гэта не мая краіна, Чарнакніжнік, не мая!

— Вядома, спадарычна. У тваёй краіне да таго часу не застанецца ніводнага рыцара.

— Ну й добра. Я радая. Рыцарам ня месца ў вязьніцах, рыцары мусяць біцца да скону – але ж я не хачу, каб яны каналі!

— А дакуль мусіць біцца цмок?

— …Лепш скажы, што было далей. Цмок забраў князёўну ў свой замак, а каханы вызваліў яе. Так?

— Не зусім так… Ці бачыш, спадарычна, у той краіне не засталося замкаў. А ў той князёўны не было каханага – яна была йшчэ маленькая. Як ты.

— Я не маленькая!!! …Ну нехта ж мусіў яе ўратаваць. Распавядай, Чарнакніжнік, а то… я паклічу тату!..

— Цішэй, князёўна, цішэй, я магу нашаптаць табе казку… Але ня здольны зьмяніць канцоўку. Той цмок, ён даўно цікаваў сваю каханую — а князёўны заўсёды нараджаюцца недарэчы – і рыхтаваў ёй у падарунак краіну. Згаралі гады, кнігі, мястэчкі – ён грэўся на папялішчах (і дым Айчыны соладка шчыпаў у наздрынах). Ён піў крывяную ваду патопаў, жангляваў камянямі разбураных сьвятыняў, назіраў, як бягуць з руінаў палацаў бяздомныя здані – і селяцца ў душах сваіх жа нашчад-

каў, як нараджаюцца ад гэтых саюзаў яшчараняты й заляцаюцца да местачковых князёўнаў. Але гэты цмок – ён быў верны; ён прапанаваў сваёй князёўне ўвесь гэты край і новую скрыпку. Як ты думаеш, спадарычна, што было далей? Што адказала тая князёўна?.. Памятай, яна была вельмі падобная да цябе…

— Гэта не мая краіна! Не мая!!!

## *МАЦІ-КРАІНА*

*Я не пазнаю сваю краіну. Вось толькі што я адвярнулася (каб зрабіць хатняе заданьне па гісторыі й мове) – а мая красуня маці, мая краіна, ператварылася ў сьпітую старую з апухлым тварам. Калі пасьпела яна раздаць і прапіць дарагія ўбраньні, зьнесьці татаву бібліятэку ў букіністычную кнігарню, а пацеркі, з якімі я так любіла гуляць, — у ламбард?! Яна зьбірае пустыя пляшкі й мармыча сябрам-бамжам пра былую прыгажосьць і славу. Ды хто пазнае ў безгустоўнай звыродлівай жабрачцы колішнюю ганарліўку-князёўну?! Дзе шляхетнасьць, манэры, адукацыя?.. (Хіба ў той упартай зморшчынцы ля вачэй, ды ў гэтым жэсьце рукі…) Яна густа фарбуе твар (каб схаваць сябе сапраўдную?), брыдкасловіць, яна неперабарлівая ў знаёмствах… краіна-маці, якую варта пазбавіць бацькоўскіх правоў. Каб ужыцца з ёй, нам трэба разьехацца — і шкадаваць здалёк яе колішнюю, князёўну, у якой вырасла луска й зьмяіны хвост, князёўну, якая стала цмокам. Як вярнуць цябе, мама?.. Ты не навучыла мяне маліцца, дзе ўжо мне – навучыць цябе…*

*Не, ня так, ня так, ня тыя словы… Ня будзьма нашчадкамі Хама! Калі нашая краіна заснула п’яная, прыкрыем яе ад кплівых вачэй, адыдзем на дыбачках. Згадайма, як мы любілі яе, калі былі маленькія…*

*Пакуль мама сьпіць, прыбярэм у хаце. Выганім цмокаў, што разьвяліся ў брудзе, памыем падлогу. МАМА хутка прачнецца – ёй будзе прыемна.*

111

*Мая краіна разьбілася шклянымі караламі. Я прыйшла надта позна, апошнія пацеркі прасьлізнулі між пальцамі – на каменнай падлозе блішчасты пыл. Я ня стану яго падымаць (я баюся парэзацца). Яшчэ ня змоўкла замкавае рэха, не, гэта скразьняк з-за павароту… ці ўсё-ткі ёсьць надзея? Ці ўсё-ткі там, дзе паўднёвыя сходы, каціцца па галерэі апошні празрысты шарык, у якім кропелькай паветра застыла мая краіна?*

*Яшчэ ня позна — я ня ведаю, з якога акенца, з якой стрэльчатай аркі, з-за парэнчаў якой часткі сьвету паляціць да мяне, на дно майго мураванага калодзежу, той шарык – я злаўлю яго, абавязкова злаўлю.*

*Калі пасьпею… пакуль не згарэў мой лемантар, пакуль не ўпала падстрэленая вежа, пакуль рыцар смыкам б’ецца з яшчарам, пакуль цмок кахае сваю князёўну, а князёўна гуляе з кацяняткам і верыць у свой край, — я злаўлю апошнюю сваю пацерку, калі толькі пасьпею паверыць – што ўсё яшчэ можа скончыцца добра.*

111

*Вецер, вецер над багнаю носіць сьцягі й цені,*
*цмокаў, князёўнаў, рыцараў, храмы, скрыпкі і душы,*
*з пляцу сарваў брукаванку, зьмяшаў са шклянымі каралямі,*
*гоніць сухое лісьце, і валуны, і малітвы.*

*Бачыць усё Чарнакніжнік, толькі зьмяніць ня здольны:*
*адну князёўну спалілі, другую скармілі цмоку.*
*Сышла ў манашкі трэцяя, каб адмаліць Радзіму,*
*Піша штодня кнігі, трызьніць штоночы ля полымя:*

*бачыць, б’юцца ў агмені два залатыя цмокі*
*з вачыма яе каханага – казачніка-Чарнакніжніка.*
*Асадку пакінь, князёўна: нават калі праз ахвяру*
*сьвятою станеш аднойчы – для ненажэрнага цмока,*
*цмока тваёй краіны, — гэтага будзе мала!*

*…Рыцар сухотны кашляе вершамі на паперу:*
*піша часьцінкамі лёгкіх, піша часьцінкамі сэрца.*
*Вочы заплюшчы, рыцар, бітва твая прайграная:*
*гэта ня тая краіна і не твая князёўна.*

*Яшчара каранавалі: вось ён чытае прамову*
*пра дабрабыт краіны – глуханямой жабрачкі,*
*пляскаюць з залы шчасьлівыя рыцары ды князёўны.*
*Плачуць цені герояў над шклянымі каралямі.*

*Вецер зблытаў эпохі. Скрыпка над пляцам, скрыпка*
*кліча кудысьці памяць, ніжа на струны казкі.*
*Я заплюшчваю вочы. Я разарваць ня ў стане*
*сярэднявечны трохкутнік: рыцар – князёўна – цмок.*
*Дай мне рады, спадарычна, можа, ты маеш веру,*
*можа, яшчэ ня позна:*
*як думаеш, што было далей?..*